# ФЭНОМЭН ЖАНЧЫНАЎ У БЕЛЫМ: ГЕНДАРНАЕ ВЫМЯРЭНЬНЕ БЕЛАРУСКІХ ПРАТЭСТАЎ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ 2020 — ПАЧАТКУ 2021 ГОДУ

Уладзіслаў Іваноў

## THE PHENOMENON OF WOMEN IN WHITE: THE GENDER DIMENSION OF THE BELARUSIAN PROTESTS OF THE SECOND HALF OF 2020-EARLY 2021

© Uladzislaŭ Ivanoŭ

PhD, associated professor, European Humanities University, Academic Department of Social Sciences
17 Savičiaus Str., 01127 Vilnius, Lithuania

ORCID ID: 0000-0003-1493-0017
E-mail: uladzislau.ivanou@ehu.lt

*Abstract*: The subject of this article is the phenomenon of women in white who came out in the streets of Belarusian cities to silently protest against the violence of the dictatorship and to show solidarity with those arrested, beaten and killed by the dictatorial police. This form of peaceful protest by women is analyzed from a historical point of view, but also compared to other protest movements found in democracies (Belgium, France) and in dictatorships (Cuba, Argentina in 1976 -1983). It is interesting to note that in the 19th century Belarus already experienced such a women‘s protest movement known as a movement of women in black.
The women‘s protests also known as the white marches have become the object of political, sociological, ethnological and gender interest. The phenomenon is analyzed in the text from the perspective of these disciplines. The starting point of the peaceful protest study is the perspective of social movements in general. Gradually a gender perspective and especially the specificity of social movements under the dictatorship are added to the analysis. An approach to gender ethnology and in particular the use of Françoise Héritier’s concept of differential valence of the sexes are especially enriching to understanding the women in white movements. Finally, the comparison to other women in white movements that exist today

This work is licensed under a Creative Commons Attribution-Noncommercial-No Derivative Works 4.0 International License


ISSN 2538-886X (online)

or have existed before allows us to consider possible scenarios of its evolution.

*Keywords*: social movements, Belarusian women's protests, women in white, white marches, protests under authoritarianism, peaceful protests, differential valence of the sexes, history of women's protests, women in black.

## Уступ

Фэномэн жанчынаў у белым, які выявіўся ў 2020 годзе і актывізаваў беларускія пратэсты пасьля жнівеньскай фальсыфікацыі выбараў, асабліва пасьля пэўнага замаруджваньня агульных пратэстаў у выніку жорсткай рэакцыі рэжыму, вядомы цяпер у сьвеце і цікавіць як палітолягаў, мастацтвазнаўцаў, сацыёлягаў, этнолягаў, так і гендарных дасьледнікаў. Калі ў сусьветнай пратэставай практыцы XX–XXI стст. вядомыя гэтак званыя «белыя маршы», «рухі жанчынаў у белым» у лацінаамэрыканскіх краінах (Аргентына (Les folles de la Place, 2016), Куба (Cuba's «Ladies in White», 2006)) і ў Эўропе (Бэльгія (Tondeur, 1997), Францыя (Godin, 2014)), то ў беларускай палітычнай гісторыі жанчыны ў белым могуць падацца досыць новай зьявай. Важна адразу адзначыць, што белы колер у палітычна-гістарычнай пэрспэктыве мае досыць няпростыя азначэньні і асацыяцыі: ён часта асацыюецца з манархізмам, таксама з антыкамунізмам (Sawer, 2007). Аднак часьцей за ўсё белы колер зьвязваецца для бальшыні з пацыфізмам. Белы колер — гэта таксама райскі колер, які сыгналізуе аб фантазіі сьвету, у якім няма ані гвалту, ані болю. Якраз як колер чысьціні, міру, негвалтоўнасьці, часам цнатлівасьці ён асабліва важны ў кантэксьце сучаснага беларускага пратэсту і яднае ўсе падобныя «белыя рухі» (Sawer, 2007). Пры гэтым часта прынцыпова рознымі зьяўляюцца прычыны актывізацыі і мабілізацыі жанчынаў, якія пратэстуюць пад белым колерам. Аднак, акрамя колеру, гендарнае вымярэньне таксама яднае розныя па сутнасьці і па форме мабілізацыі рухі жанчынаў. Усе вядомыя белыя рухі ці маршы ў бальшыні выпадкаў, і тым больш у недэмакратыі, пачыналіся і ажыцьцяўляліся кабетамі. Таму мэтай аналізу зьявы жанчынаў у белым у Беларусі ў 2020–2021 гадах зьяўляецца выяўленьне прычынаў жаночай пратэставай мабілізацыі, разуменьне беларускай спэцыфікі і агульнай лёгікі іншых падобных жаночых белых рухаў і маршаў. Таксама важным бачыцца выяўленьне гістарычнай асновы фэномэну беларусак у белым: ці гэта спантанны новы пратэст, ці ён мае гістарычныя прэцэдэнты?

Каб адказаць на гэтыя пытаньні, у працы выкарыстаныя наступныя мэтады дасьледаваньня: аналіз прэсы (беларускай

незалежнай і афіцыйнай, таксама замежных выданьняў, пераважна летувіскіх і францускіх) за пэрыяд жнівень — сьнежань 2020 году, аналіз другарадных дадзеных за пэрыяд жнівень 2020 — жнівень 2021 (аналітыка, інтэрвію зь лідаркамі жаночых маршаў, дасутпныя ў электронных СМІ), гендарны і гістарычны аналіз падзеяў (выяўленьне і аналіз падобных падзеяў у мінулым, аналіз прычынаў і разьвіцьця жаночых пратэстаў у мінулым, тлумачэньне прычынаў выключна жаночага характару пратэсту і ўстрыманьня мужчынаў ад пратэсту), параўнаўчы мэтад (параўнаньне як з вонкавымі падобнымі зьявамі (Куба, Аргентына ў мінулым), так і з падобнымі зьявамі ў самой Беларусі ў XIX стагодзьдзі).

Важнымі канцэпцыйнымі паняткамі працы зьяўляюцца: *сацыяльны рух*, *жаночыя пратэсты*, *жанчыны у белым*, *белыя маршы*, *пратэст ва умовах аутарытарызму*, *мірныя пратэсты*, *гісторыя жаночых пратэстау*, *жанчыны у чорным*. Таксама ў аналізе задзейнічаная этналягічная навука і ўнёсак францускай этналягіні Франсуазы Эрыт'е зь ейным вядомым канцэптам *адрозная каштоунасьць палоу* (Héritier 2008). Варта адзначыць важную ролю этналёгіі ў міждысцыплінарным падыходзе падчас аналізу жаночых пратэстаў. Якраз гендарная этналёгія прапаноўвае дакладнае вызначэньне і тлумачэньне маргінальнасьці ці меншай каштоўнасьці жанчынаў у традыцыйных, а таксама аўтарытарных культурах і, адпаведна, іншых чаканьняў ад іх з боку традыцыяналісцкай улады. Недаацэньваньне ці аднабаковае ацэньваньне кабетаў з боку ўладных мужчынаў ці ўлады якраз вядзе да такіх пратэставых эфэктыўных і нечаканых тактыкаў, якія прадэманстравалі беларускі ў белым. Зрэшты, пратэставыя жаночыя рухі разглядаюцца як частка і адзін з кшталтаў сацыяльных рухаў. Гендарная спэцыфіка пратэставых сацыяльных рухаў у Беларусі і ў іншых краінах будзе рагледжаная ў наступных частках.

Інтарэс да дадзенай тэмы выкліканы адначасова акадэмічна-дасьледніцкімі і грамадзянскімі прычынамі: з аднаго боку, пазыцыя грамадзяніна абумоўлівае інтарэс і салідарнасьць, з другога боку, дасьледніцкі выклік зьвяртае да новай тэмы сваімі пэрспэктывай, недасьледаванасьцю, нераспрацаванасьцю, а таму і магчымасьцю далучыцца да новага дасьледчага поля. Зрэшты, гендарныя вымярэньне і актуалізацыі тэмы прыцягваюць увагу вялікай часткі дасьледнікаў і дасьледніцаў: жаночая пратэставая актыўнасьць, зьява беларусак у белым, як ніколі раней, даводзяць аб важнасьці, практычнай скіраванасьці гендарнай тэмы, гендарнага аналізу, якія дасюль ігнараваліся і недаацэньваліся ў Беларусі і рэгіёне наагул. Такім парадкам, дадзенае дасьледаваньне ўвасабляе міждысцыплінарную працу на сутыку палітычнай навукі, сацыялёгіі, этналёгіі і гендарных дасьледаваньняў. Міждысцыплінарны характар працы дапамагае да ўсяго справіцца з праблемай недастатковай колькасьці акадэмічнай літаратуры па гэтай досыць

сьвежай тэме ў беларускім выпадку. Бо на дадзены момант не існуе вялікага корпусу акадэмічнай літаратуры па тэме беларускіх пратэстаў 2020 году, у прыватнасьці, па жаночай пратэставай актыўнасьці. Тым ня менш паступова зьяўляюцца эсэ і акадэмічныя артыкулы, якія запаўняюць лякуны і прапануюць разнастайныя пазыцыі, традыцыі і інструмэнты аналізу фэномэну жанчынаў у белым у Беларусі. Сярод асноўных хацелася б адзначыць наступныя артыкулы: Натальля Паўловіч, «How Feminist is the Belarusian Revolution? Female Agency and Participation in the 2020 Post-Election Protests» («Наколькі фэміністычная беларуская рэвалюцыя? Жаночае пасярэдніцтва і ўдзел у пасьлявыбарчых пратэстах 2020 году») (Paulovich, 2021); Славамір Серакоўскі, «Belarus Uprising: The Making of a Revolution» («Беларускае паўстаньне: зьдзяйсьненьне рэвалюцыі») (Sierakowski, 2020); Аляксандар Бузгалін, Андрэй Калганаў, «The Protests in Belarus: Context, Causes and Lessons» («Пратэсты ў Беларусі: кантэкст, прычыны і ўрокі») (Buzgalin, Kolganov, 2021); Івона Рэйхард, Максім Руст, «The failure in binary thinking about Belarus» («Збой бінарнага мысьленьня пра Беларусь») (Reichardt, Rust, 2021); Нэлі Бэкус і Міша Габовіч, «Introduction: The Sociology of Belarusian Protest» («Уступ: Сацыялёгія беларускіх пратэстаў») (Bekus, Gabowitsch, 2021); Нэлі Бэкус, «Echo of 1989? Protest Imaginaries and Identity Dilemmas in Belarus» («Рэха 1989 году? Уяўныя пратэсты і дылемы ідэнтычнасьці ў Беларусі») (Bekus, 2021); Марыя Мартысевіч, «Belarus: The Alphabet of Protest» («Беларусь: Альфабэт пратэсту») (Martysevich, 2020); Стэфан Норыс, «History, Memory, and the Art of Protest in Belarus» («Гісторыя, памяць і мастацтва пратэсту ў Беларусі») (Norris, 2021). Таксама ў дасьледаваньні пратэстаў у Беларусі, у тым ліку жаночых пратэстаў, лічу карысным аналіз падзеяў апошняга году, прапанаваны беларускім палітолягам В. Карбалевічам (Блог В. Карбалевіча, 2021). Што датычыць этналягічнага гендарнага ўнёску, то цэнтральным зьяўляецца аналіз, прапанаваны францускай этналягіняй і антрапалягіняй Франсуаз Эрыт'е (Héritier, 2008; Héritier 2010) і польскай этналягіняй і беларусісткай Ганнай Энгелькінг (Rewolucja mirnych ludiej, 2020).

Зрэшты, спэцыфікай дадзенага дасьледаваньня і асноўнымі важнымі адрозьненьнямі ад іншых дасьледаваньняў зьяўляюцца:

- аналіз гістарычнай асновы беларускіх жаночых пратэстаў, маршаў;
- гендарная параўнаўчая пэрспэктыва белых беларускіх маршаў з падобнымі белымі пратэставымі рухамі ў іншых недэмакратыях (Аргентына, Куба), а таксама ў некаторых дэмакратыях (Бэльгія, Францыя), дзе таксама існаваў рух жанчынаў у белым;
- этналягічны ўнёсак у аналіз жаночых пратэстаў.

## Сусьветныя практыкі белых пратэставых рухаў: гендарнае вымярэньне

Адразу вызначымся з цэнтральным паняткам «сацыяльны рух», які ў палітычнай сацыялёгіі вызначаецца досыць шырока і сынанімічны панятку «пратэставы рух» (Нёвё, 2010: 15). Бо ў існасьці любы сацыяльны рух у той ці іншай ступені пратэставы, таму што нават мірныя ці маўклівыя акцыі, якія мабілізуюць людзей, артыкулююць пэўныя патрабаваньні і скіраваныя супраць чагосьці ці кагосьці, то бок маюць на мэце выклік ці пратэст — супраць гвалту, бязьдзейнасьці ўладаў і пад. Як заўважае сацыёляг і дасьледнік сацыяльных рухаў Эрык Нёвё, нават «новыя эмацыйныя рухі» ці «рухі салідарнасьці», да якіх звычайна адносяць «белыя маршы» і якія звычайна носяць кансэнсусны характар і ня маюць праціўнікаў, усё адно зьяўляюцца пратэставымі (Нёвё, 2010: 26) у агульным сэнсе: яны праяўляюць незадаволенасьць, нязгоду, напрыклад, зь несправядлівым сьветам, трагізмам сытуацыі і пад. І потым, трактуючы сацыяльны рух як форму супольнага дзеяньня, накіраванага на карысьць пэўнай справы, мы па сутнасьці маем справу з палітычным удзелам, як лічыў Ален Турэн (Нёвё, 2010: 21). Гэта азначае, што ўсе сацыяльныя рухі, нават тыя, што заяўляюць аб сваёй апалітычнасьці, зьяўляюцца палітызаванымі ці артыкулююць, нясуць, між іншым, і палітычнае пасланьне. Асабліва выразна гэта бачыцца ў недэмакратыі, дзе клясычныя каналы палітычнага ўдзелу заблякаваныя ці карумпаваныя. Якраз пад гэтую катэгорыю трапляюць белыя рухі, белыя маршы кабетаў у Аргентыне, Кубе і Беларусі. І, наадварот, бэльгійскія і францускія «маўклівыя» ці белыя маршы, хоць і выкарыстоўвалі белы колер і мабілізоўвалі пераважна жанчынаў, але ўсяляк падкрэсьлівалі апалітычны ці нэўтральна палітычны характар пратэстаў (Godin, 2014). Тут месьціцца прынцыповае адрозьненьне дзейнасьці белых маршаў ва ўмовах дэмакратыі і недэмакратыі.

Гендарнае вымярэньне сацыяльных рухаў актыўна дасьледуецца ў заходняй традыцыі з 90-х гадоў мінулага стагодзьдзя. Так, аналізуючы сучасныя сацыяльныя рухі, Даніэль Кергаа, француская дасьледніца новых формаў рухаў, прапануе гендарную прызму сацыяльных рухаў і ўводзіць панятак «гендарны сацыяльны рух» (Нёвё, 2010: 102). Сацыялягіня вядзе размову не пра старыя і ўжо клясычныя прыклады сацыяльных рухаў, як фэміністкія ці гей-рухі, а пра цалкам новыя пратэставыя рухі, якія аб'ядноўваюць жанчынаў адначасова па прыкмеце полу і прафэсіі — санітарак, напрыклад. То бок гендарная пэрспэктыва скіроўвае нас да разуменьня спосабаў, з дапамогай якіх палы — у выніку няроўнага падзелу прафэсійных і хатніх абавязкаў — выбудоўваюць сацыяльныя адносіны і выкарыстоўваюць іх унутры руху (Kergoat, 1992). Напрыклад, рух санітарак у Францыі ў 90-я гады XX стагодзьдзя

стаўся ўжо клясычным прыкладам гендарнага сацыяльнага руху. Сама праца санітарак гендарна абумоўлена нібыта пакліканьнем кабетаў даглядаць хворых: абсалютная бальшыня санітарак — жанчыны. Прафэсія мэдбрата ня толькі не папулярная, але і мае часта насьмешлівае гучаньне. Традыцыйнае чаканьне і разьмеркаваньне прафэсійных кампэтэнцыяў паводле полу прывяло да таго, што ад санітарак амаль натуральна чакалася, што гэта ня тое што прафэсійнасьць, але іх тоеснасьць, натуральныя жаночыя атрыбуты. Гэта і выклікала пратэст санітарак, якія не жадалі, каб на і без таго ня вельмі добрую аплату ўплывалі нібыта іх натуральныя жаночыя мяккасьць і спагадлівасьць (Нёвё, 2010: 102). Гэты прыклад пратэсту дэманструе, наколькі гендарна асымэтрычна пабудаванае нават заходняе грамадзтва і што на сацыяльныя рухі ўплываюць традыцыйна выбудаваныя гендарныя адносіны. Варта асобна адзначыць сьлёган, пад якім часта выступалі санітаркі: «Ni bonnes, ni nonnes, ni conne» (Retour sur la Coordination des Infirmières, 2015), што можна перакласьці як «Ані чалядніцы, ані мнішкі, ані дурніцы». Сьлёган якраз трапна скіраваны супраць стэрэатыпаў вакол ролі жаночага ў сучасным грамадзтве.

Каб лепей і паўней зразумець пратэставую зьяву жанчынаў у белым у Беларусі ў 2020–2021 гадах, варта пазнаёміцца з падобнымі рухамі ў іншых рэгіёнах. Белы колер і пол удзельніцаў пратэставых рухаў — гэта першае, што аб’ядноўвае аргентынскіх мацерак зьніклых дзяцей падчас дыктатуры 1976–1983, кубінскіх да́маў у белым 2003 году, а таксама бэльгійскіх (1986), францускіх (2013–2015) і швайцарскіх пратэстовак у зьвязку са зьніклымі дзецьмі, якія былі забітыя пэдафіламі (Les marches blanches se multiplient, 2015). У астатнім кантэкст, у якім паўсталі рухі, а таксама прычыны часта адрозьніваюцца ўва ўсіх пералічаных прыкладах. Спачатку сьцісла прааналізуем жаночыя белыя пратэсты ў недэмакратыі, а потым на прыкладзе дэмакратычных краінаў.

### Аргентынскі рух маці з пляцу Траўня (1977–2021)

«Маці з пляцу Траўня» — асацыяцыя аргентынскіх маці, чые дзеці «зьніклі», былі забітыя падчас «бруднай вайны», якая вялася, у прыватнасьці, ваеннай дыктатурай (1976–1983) (Sarner, 2000). Назва паходзіць ад пляцу Траўня (Plaza de Mayo) у Буэнас-Айрэсе, дзе з 30 красавіка 1977 году маці штотыднёва зьбіраліся і моўчкі маніфэсталі. На працягу сарака гадоў яны змагаліся за тое, каб знайсьці сваіх дзяцей, выкрадзеных ваеннай дыктатурай (1976–1983). Некаторыя з заснавальніцаў, у сваю чаргу, былі забітыя ў сьнежні 1977 году. У канцы 1970-х — пачатку 1980-х гадоў дыктатарскі ўрад спрабаваў падаць мацерак і бабуль за «вар’ятак» і «маці тэрарыстаў» (Les folles de la Place, 2016: 23), якія адправіліся на пошукі зьніклых дзяцей. Хунта дала ім такую мянушку з мэтай дыскрэдытацыі, але

неўзабаве мянушка ператварылася ў камплімэнт (Sarner, 2000). У знак пратэсту маці насілі белыя хусткі (першапачаткова гэта былі зробленыя з тканіны падгузкі іх немаўлятаў) у памяць аб зьнікненьні сваіх дзяцей. Яны зьбіраліся кожны чацьвер удзень на пляцы і хадзілі па ім паўгадзіны супраць гадзіньнікавай стрэлкі, сымбалічна вяртаючыся ў мінулае і крытыкуючы беспакаранасьць рэжыму і жаўнераў, адказных за забойствы і катаваньні (Mothers of the Plaza de Mayo, 2011).

Падабенствы зь беларускім белым жаночым пратэстам: дзейнасьць ва ўмовах дыктатуры, белы колер — сымбаль чысьціні і цноты як удзельніцаў маршаў, так і зьніклых і забітых дзяцей, выключна мірны характар пратэсту, моўная дыскрэдытацыя, а таксама фізычны гвалт і забойства рэжымам некаторых пратэстовак (у беларускім выпадку — пратэстоўцаў). Да ўсяго ў дыктатарскіх Аргентыне і Беларусі рэжым апраўдваў гвалт падрывам стабільнасьці краіны і абінавачваў Захад у фінансаваньні пратэстаў (Wright, 2006: 160). Падабенства і ў тым, што паступова жаночыя пратэсты ва ўмовах жорсткай дыктатуры застаюцца адзіным пратэставым і нават становяцца праваабарончым рухам.

Да асноўных адрозьненьняў варта аднесьці ўсё ж больш гвалтоўны і крывавы характар аргентынскай хунты, якая вынішчыла ад 10 000 да 30 000 чалавек, ад 500 000 да 1 000 000 аргентынцаў зьехалі ў выгнаньне (Rodríguez, Soprano, 2009). Аднак варта ўлічваць большы тэрмін існаваньня аргентынскай хунты — 7 гадоў. Таксама аргентынскія маці выйшлі на пляц дзеля сваіх забітых дзяцей, тады як беларускі выйшлі праз салідарнасьць з усімі пацярпелымі беларусамі падчас акцыяў пратэсту супраць фальсыфікацыі выбараў. Такім парадкам, асабістыя прычыны пратэсту былі адрозныя, і сярод беларусак у белым прысутнічалі ўсе ўзроставыя катэгорыі жанчынаў, тады як сярод аргентынак былі пераважна кабеты сярэдняга і сталага веку. Зрэшты, не зважаючы на жорсткасьць аргентынскай хунты, яна так і не змагла цалкам перамагчы жанчынаў і адваяваць у іх сымбалічную прастору цэнтральнага пляцу, тады як беларускі рэжым на дадзены момант амаль цалкам выціснуў жанчынаў у белым з публічнай прасторы.

### Кубінскія да́мы ў белым (2003–2021)

Кубінскія жанчыны ў белым — грамадзкі рух, заснаваны ў 2003 годзе, пасьля хвалі рэпрэсіяў, вядомай як «Чорная вясна» (On Fourth Anniversary of Clampdown, 2007). У часе «Чорнай вясны» 2003 году кубінскія ўлады арыштавалі, без суда катавалі ды зьняволілі 75 праваабаронцаў, незалежных журналістаў ды бібліятэкараў на турэмныя тэрміны да 28 гадоў за патрабаваньне правядзеньня рэфэрэндуму наконт увядзеньня свабодных выбараў, свабоды прэсы, слова і веравызнаньня. Дзяржава абвінавціла ўсіх у «дзейнасьці супраць

незалежнасьці ці тэрытарыяльнай цэласнасьці дзяржавы», у тым ліку прыналежнасьці да «нелегальных арганізацый», прыняцьці грошай ад прадстаўніцтва ЗША ў Гаване, «рабаўніцтвах», «тэрарыстычнай дзейнасьці» і супрацоўніцтве з замежнымі СМІ (On Fourth Anniversary of Clampdown, 2007).

Рух пачынаўся як штонядзельныя шэсьці ў белых вопратках (колер быў выбраны таксама, як і ў іншых белых рухах, праз тое, што сымбалізуе чысьціню і цноту) жонак ды іншых сваякоў зьняволеных кубінскіх дысыдэнтаў. Рух пратэстуе супраць аўтарытарызму кубінскага рэжыму, перасьледу праваабаронцаў, турэмнага зьняволеньня шматлікай колькасьці палітвязьняў (Cuba's Ladies in White released after weekend arrest, 2012). Рух дзейнічае да сёньняшняга дня, не зважаючы на сьмерць адной з галоўных постацяў руху — Ляўры Палян.

Прычына ўзьнікненьня руху, пасланьні ўдзельніцаў, мірныя тактыкі, якія выкарыстоўваюць кубінскія да́мы ў белым, белы колер, з аднаго боку, і рэакцыя кубінскіх аўтарытарных уладаў (шматгадовы аўтарытарны рэжым, культура і ўмовы дзеяньня ўладаў, шуканьні заходняга сьледу ў актыўнасьці дамаў у белым, запалохваньні, арышты, шантаж, зьбіцьцё, звальненьні), з другога боку, амаль цалкам ідэнтычныя таму, што мы назіраем у Беларусі на прыкладзе жанчынаў у белым і рэакцыі беларускай дыктатуры. З усіх вядомых прыкладаў жаночых пратэстаў у недэмакратыі кубінскі выпадак найбольш блізка нагадвае беларускую сытуацыю.

### Бэльгійскі белы, ці маўклівы, марш (1996)

Бэльгійскі белы марш, ці пратэст 1996 году, мае іншую гісторыю і прычыну. Ён стаў вынікам справы Марка Д'ютру, пэдафіла і сэрыйнага забойцы. Маўклівы марш, ці белы марш, як празвалі яго бэльгійскія СМІ, — гэты выраз выкарыстоўваецца для абазначэньня маршу, арганізаванага ў выніку зьнікненьня чалавека ці сьмерці ахвяры пэдафіла ці забойцы. Звычайна белыя маршы арганізуюцца роднымі ахвяраў, і звычайна ахвяра зьяўляецца дзіцём, падлеткам або жанчынай, якія былі выкрадзеныя, згвалтаваныя і забітыя. Часам белыя маршы ладзяцца і тады, калі цела ахвяры ня знойдзена (Godin, 2014: 169–170). Бацькі ахвяраў просяць «удзельнікаў шэсьця» прыйсьці ў белым, бо гэта нэўтральны, апалітычны колер, белы сымбалізуе дзяцінства і нявіннасьць (Les marches blanches se multiplient, 2015). Навізна маўклівых белых маршаў палягае ў тым, што яны нічога не патрабуюць, не шукаюць палітычных праціўнікаў, справядлівасьці і не імкнуцца заваяваць палітычны ці іншы капітал. Белы марш — абсалютна мірны, скіраваны на кансэнсус, гэта супрацьлегласьць агрэсіўным маршам і маршам, якія маюць на мэце лінчаваньне канкрэтных асобаў (Godin, 2014). Пры гэтым белы марш усё адно застаецца пратэставай, няхай

і маўклівай, апалітычнай актыўнасьцю, бо пратэстуе, прынамсі, супраць гвалту. Зрэшты, як заўважаюць дасьледнікі белых маршаў, белыя шэсьці зьяўляюцца да ўсяго новым кшталтам эмацыйных пратэставых рухаў, якія публічна артыкулююць і выказваюць жалобу. Апошняя важная рыса бэльгійскага белага маршу — гэта тое, што ён паўстаў спантанна, стыхійна, у ім адсутнічаюць арганізатары. Хоць наступныя белыя маршы, якія праводзіліся ў Бэльгіі, часта ініцыяваліся бацькамі забітых ці мясцовымі ўладамі (Godin, 2014).

Навідавоку адрознасьць бэльгійскіх белых маршаў і жаночых маршаў-пратэстаў у Беларусі: розны тып палітычнага рэжыму, удзел мужчынаў разам з жанчынамі ў маўклівых маршах у Бэльгіі і выключна жаночыя маршы ў Беларусі, апалітычнасьць бэльгійскіх маршаў і палітычнасьць, нават палітызаванасьць, беларускіх акцыяў, прычыны выхаду на вуліцу (пэдафілія, забойства дзяцей у Бэльгіі і палітычныя перакруты ў Беларусі). Аднак існуюць і пэўныя важныя падабенствы: выключна мірны і кансэнсусны характар пратэстаў, адсутнасьць агрэсіўнага пасланьня, а выключна пасланьне салідарнасьці. Да ўсяго пратэстоўкі ў Беларусі і пратэстоўцы ў Бэльгіі мінімальна выкарыстоўвалі плякаты і лёзунгі, асноўнае пасланьне заключалася ў мірным і часта маўклівым шэсьці — нагадцы пра бяду, гора, пагрозу. Сацыяльная разнастайнасьць — яшчэ адна важная супольная для беларускага і бэльгійскага выпадкаў характарыстыка белых маршаў.

### Францускія белыя маршы (2010, 2013)

Францускія белыя маршы ўзьніклі пад уплывам бэльгійскага белага маршу 1996 году (Les marches blanches se multiplient, 2015). Калі спачатку белыя маршы ў Францыі таксама ладзіліся ў знак падтрымкі родных ахвяраў пэдафіліі, то паступова яны пачалі ладзіцца, каб аддаць даніну павагі забітым дарослым, ахвярам мэдычных памылак, дарожна-транспартных здарэньняў ці забітым у выніку нападу злачынцы. У 2010 годзе ў Францыі ў дэпартамэнце Эна нават адбыўся белы марш у падтрымку жывёлаў, зь якімі дрэнна абыходзяцца гаспадары (Godin, 2014). Цікавая эвалюцыя белых маршаў у бок унівэрсалізацыі спэцыфічнага першапачаткова сацыяльнага руху ў дэмакратыі абумоўленая перадусім кампрамісным і апалітычным характарам руху. Пад парасонам кампрамісу і апалітычнасьці ў дэмакратыі могуць знайсьці сабе месца многія рухі, асацыяцыі і кампаніі. Зрэшты, як заўважае Крысьціян Гадэн, францускі філёзаф і дасьледнік белых ці маўклівых маршаў у Бэльгіі і Францыі, у дэмакратыі гэтыя маршы часта ператвараюцца ў папулісцкія рухі ці выкарыстоўваюцца папулісцкімі палітыкамі (Godin, 2014). Ва ўмовах недэмакратыі — напрыклад, у Беларусі — празь першапачатковую

палітызаванасьць белыя пратэсты якраз захоўваюць сваю прадэмакратычную скіраванасьць.

Падсумоўваючы параўнаньне розных прыкладаў белых пратэстаў, неабходна паўтарыць, што прынцыповым адрозьненьнем паміж белымі ці маўклівымі кансэнсуснымі маршамі ў Бэльгіі і Францыі і жаночымі пратэставымі рухамі ў Аргентыне, Кубе і Беларусі зьяўляецца тое, што дэмакратычны/недэмакратычны кшталт рэжыму абумоўлівае палітызаванасьць рухаў у недэмакратыі і, наадварот, нэўтральнасьць у дэмакратыі. Да ўсяго белыя маршы ў Бэльгіі і Францыі ўзьніклі як эмацыйная рэакцыя на гвалт пэдафілаў, а таму ня мелі палітычнага праціўніка, тады як жаночыя пратэставыя рухі ў пералічаных дыктатурах не належаць да новых эмацыйных рухаў, а маюць канкрэтных праціўнікаў, зьяўляюцца палітызаванымі і скіраваныя на пэўную дэмакратызацыю. Таксама ўсе белыя пратэставыя рухі ў дыктатуры маюць наступнае падабенства: актыўнасьць пратэстовак маргіналізуецца, ачарняецца, шукаецца замежны сьлед у іх фінансаваньні, да ўсяго яны ўсяляк падаюцца ў нэгатыўным сьвятле, трактуюцца рэжымам як «шалёныя», «ненармальныя», як «дрэнныя маці і жонкі» (Les folles de la Place, 2016: 23) і пад. Важна адзначыць, што асабліва ў дыктатурах палітычна, эканамічна жанчыны недаацэньваюцца ўладай, і гэта становіцца ў далёкай пэрспэктыве ключавой памылкай дыктатара і атачэньня. У дэмакратыі ж не назіраецца ані дыскрэдытацыі, ані крытыкі «белых пратэстоўцаў».

## Гістарычная пэрспэктыва жаночых каляровых пратэстаў у Беларусі: ад жанчынаў у чорным да жанчынаў у белым

Гістарычны аналіз і пошук паралеляў з сучасным белым жаночым пратэставым рухам дазваляюць часткова адкінуць тэзу аб выключнай спантаннасьці і навізьне фэномэну жанчынаў у белым у Беларусі. У мясцовай палітычнай гісторыі вядомыя іншыя пратэсты беларусак, праўда, часьцей яны афармляліся пад іншымі колерамі — чорным, напрыклад. Чорны колер — колер жалобы, з дапамогай якога шляхцянкі, гараджанкі ды жанчыны зь іншых клясаў і сацыяльных катэгорыяў пратэставалі супраць гвалту 1861 году, а пазьней — супраць вынішчэньня і высылкі ўдзельнікаў паўстаньня 1863 году. Пра гэты фэномэн пісалі многія польскія і зусім рэдка беларускія дасьледніцы, гісторыкі, гэтая зьява вядомая пад назовам «ціхія геройкі». Так, польская дасьледніца, публіцыстка Марыя Брухнальская (1869–1944) у 1933 годзе выдала ў Львове кнігу «Ciche bohaterki» («Ціхія геройкі») (Bruchnalska, 1933), у якой сабрала вялікі сьпіс кабетаў у чорным, якія ўдзельнічалі ў паўстаньні 1863 году. Ці не ўпершыню дасьледніца прааналізавала паўстаньне

1863 году праз прызму і з улікам кабетаў, якія падтрымалі рокаш. І хоць часта зьява «ціхіх героек» апісваецца як рух палячак, гэта не зусім дакладна: рух спантанна пачаўся ў Варшаве, але паступова да яго актыўна далучыліся беларускія, а часам і летувіскія шляхцянкі, а такама гараджанкі.

Варта пазначыць, што яшчэ ў 1913 годзе, у 50-ю гадавіну паўстаньня, Марыя Брухнальская пісала, што вычыны ўдзельніцаў паўстаньня ігнараваныя, недаацэненыя, а таму імкнулася выратаваць іх ад забыцьця. Такім парадкам, публіцыстка і змагарка за правы кабетаў пачала зьбіраць інфармацыю пра ўдзельніцаў рокашу 1863 году, перавыдаваць іх дзёньнікі і ўспаміны. Яшчэ да паўстаньня 1863 году палячкі, а таксама беларускі і жмудзянкі дзейнічалі і салідарнічалі разам дзеля адзінства зямель і нацыяў ВКЛ і Рэчы Паспалітай, чым пасьпяхова ўразілі і напалохалі расейскіх каляністаў. Гэтая акцыя пад сьцягам ВКЛ і Рэчы Паспалітай стане ці не апошняй праявай салідарнасьці палячак, беларусак і летувісак. Потым новыя этапы нацыябудаўнічых працэсаў пераключаць іх на іншую дзейнасьць, і гендарная салідарнасьць зьнікне на карысьць нацыянальнай.

Жанчыны ў чорных сукенках, ці «чорныя да́мы», як часта называла іх тагачасная прэса, зьявіліся ў розных кутках былой калісьці адзінай хаўруснай дзяржавы пасьля расстрэлу расейскімі войскамі мірных дэманстрантаў у Варшаве 27 студзеня 1861 году. Кабеты ў чорных жалобных сукенках без упрыгажэньняў прыйшлі на пахаваньні забітых. Пасьля гэтага па ўсёй Польшчы, Беларусі і Летуве пайшла пратэставая хваля жанчынаў у чорным. Чорны колер сымбалізаваў сьмерць, хаўтуры, а таксама кайданы. Аднак, як пазначыў у сваім эсэ «Une nation en deuil. La Pologne en 1861» («Нацыя ў жалобе. Польшча ў 1861 годзе») францускі каталіцкі лібэрал, граф дэ Манталямбэр, гэта была ня толькі ці не перадусім жалоба па сьмерці блізкіх людзей, як жалоба па няспраўджаным, па адсутным, жалоба па скрадзенай свабодзе (Montalembert, 1861). Польская паэтка Марыя Ільніцкая ў 1861 годзе напісала верш «Do siόstr moich» («Маім сёстрам»), у якім патлумачыла, навошта чорны колер пратэстовак:

Няхай чорная сукенка полькі сьведчыць сьвету
Пра самы страшны гвалт беззаконьня (Ilnicka, 2019: 276–277).

І ня толькі беларускі і летувіскі падтрымалі гэтую хвалю салідарнасьці, але і многія іншыя эўрапейкі выказвалі спачуваньне, выходзячы ў чорных сукенках і капелюшах. Так, упрыгажэньні з чорных стразаў у Гішпаніі пэўны час называлі «польскімі сьлёзамі» (Zakrzewski, 2017). У іншых краінах кабеты насілі крыжыкі. Вядома, што такую польскую сьлязу і польскі крыж у знак салідарнасьці насіла дачка Карла Маркса. Некаторыя эўрапейкі да ўсяго

насілі імітаваныя ці рэальныя кайданкі, каб зьвярнуць увагу грамадзтва на гвалт на заходніх землях Расейскай імпэрыі. Швайцарская прэса 1861 году апісвала кабетаў у Нэўшатэлі, якія схавалі свае стракатыя сукні і насілі толькі чорныя сукенкі на польскі манер, а да ўсяго на ланцужках насілі кайданкі. Вядомая швэдзкая грамадзкая дзяячка, пісьменьніца і фэміністка Фрэдэрыка Брэмэр шмат выступала ў падтрымку «чорных дамаў» у Польшчы і Літве, называючы гэтую справу «une sainte cause», то бок сьвятая справа. Дзякуючы ёй швэдзкая каралеўская сям'я падтрымала справу і перадавала вялікія сумы ў падтрымку жанчынаў у чорным (Bruchnalska, 1933: 185).

Аднак у саміх Польшчы і Беларусі была патрэбная грамадзянская мужнасьць, каб насіць жалобу: расейскія ўлады штрафавалі чорных пратэстовак, абражаючы іх «рэвалюцыянэркамі» і «антырасейскімі фанатычкамі» (Bruchnalska, 1933: 60–61). У Менску і Дынабурзе ўлады накладалі штраф на жанчынаў у чорным — ад 25 да 100 рублёў. Часам іх адвозілі ў пастарунак, загадвалі зьняць сукенкі, а ўзамен ім выдавалі строі, адабраныя ў арыштаваных прастытутак. Палячкам і ўкраінкам у чорным, якія выходзілі на вуліцы Львову, які знаходзіўся ва ўладзе Аўстра-Вугоршчыны, было прасьцей: мясцовая паліцыя хоць і глядзела крыва на пратэсты, але дзейнічала куды больш стрымана за расейскіх калегаў.

Пасьля паразы паўстаньня Каліноўскага ў 1863 годзе ўзьнялася новая хваля грамадзянскай непакорнасьці сярод кабетаў. Зноў на вуліцах Менску, Вільні, Варшавы, Коўны, Пінску, Львова, Віцебску ці Кіева бачылі жанчынаў у чорным. Адной зь вядомых тагачасных беларусак, якой баяліся гараднічыя і губэрнатары, была Каміла Марцінкевіч, дачка Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Якраз яна была калі ня лідаркай жанчынаў у чорным, то адным з моцных сымбаляў «чорнага пратэсту». Каміла Марцінкевіч уваходзіла ў менскую філію жаночага камітэту, створанага ўлетку 1863 году (Kowalewska, 1912: 90). Гэта была жаночая арганізацыя, якая дапамагала і даглядала параненых і арыштаваных паўстанцаў. У склад гэтых камітэтаў — komitety niewiast — уваходзілі ня толькі палячкі, але і беларускі. Вычыны ціхай беларускай геройкі вядомыя ўсім: і выліваньне памыяў на галаву менскага губэрнатара, і сьпевы ў бажніцах, і сьмелыя паводзіны ў турме, сумна вядомай беларусам дасюль Валадарцы, і зьняволеньне ў вар'ятні, і граньне на фартэпіяна рэвалюцыйнага гімну «Z dymem pożarów» для агаломшанага губэрнатара (Dybowski, 1913: 35). Зрэшты, за дзёрскасьць і перадачу кветак вырачанаму на сьмерць паўстанцу саму Камілу выслалі ў Перм ці, паводле інфармацыі, пададзенай Марыяй Брухнальскай, у Архангельск (Bruchnalska, 1933: 387–388). Менская «антырасейская фанатычка», ці, як яе называлі палячкі, «менская Жанна д'Арк» (Wspomnienia wygnańca, 1908: 2) вярнулася з высылкі ў Вільню. Пахаваная ў Вільні разам з мужам на Бэрнардынскіх могілках, сёньня

Каміла Марцінкевіч зьяўляецца моцным арыенцірам і сымбалем старых і новых пратэстаў супраць гвалту і дыктатуры наагул.

Цікава пазначыць, што часам «чорных дамаў» падтрымлівалі мужчыны ў чорным. Так, вядома, што ў 1861 годзе ў Пінску да жанчынаў у чорным далучыліся паны ў чорным, якія зьбіраліся ля крыжоў і маліліся за расстраляных у Варшаве дэманстрантаў. Як і сёньня, у 1861–1863 гадах кабеты маніфэставалі ня толькі вопраткай, але і рознымі іншымі манерамі. Так, у 1861 годзе ў Коўне штраф наклалі на пані, якая ня толькі апраналася ў чорнае, але і ўпрыгожвала дома фіранкі чорнымі стужкамі, якія былі бачныя з вуліцы (Bruchnalska, 1933: 61).

Рэакцыя ўладаў на жанчынаў у чорным амаль ідэнтычная да рэакцыі цяперашняй нелегетымнай беларускай улады: арышт кабетаў, запалохваньні, шантаж, забарона насіць публічна пэўныя колеры і незьлічоныя штрафы непакорніцам. Вядомая адна забаўная ў трагічных умовах пастанова обэр-паліцмайстара Варшавы ад 1864 году, якая рэгулявала тып і колер адзеньня, што дазвалялася насіць кабетам. Так, чорная вопратка дазвалялася толькі ў выпадках рэальнай жалобы і хаўтураў, чорныя стужкі і банты нельга было насіць на белых капелюшах і пад. Улады баяліся ня толькі чорнага колеру, але і шэрага — забараняўся і ён. Часта штрафавалі кабетаў, якія рэальна насілі жалобу ці ішлі на сапраўдныя хаўтуры. Удовы былі вымушаныя пісаць прашэньні, каб ім дазволілі насіць чорны колер. Жыдоўкі, а таксама польскія і беларускія сялянкі часам баяліся насіць чорны колер, каб ня стаць ахвярамі арыштаў. У некаторых местах Расейскай імпэрыі — у Варшаве перадусім — гандлярам забаранялі прадаваць тканіну чорнага колеру. На пэўны час падобную забарону ўвяла паліцыя Аўстра-Вугоршчыны — у Львове, напрыклад.

Такім парадкам, гісторыя пратэсту жанчынаў у чорным у XIX ст. у Беларусі, Польшчы і Летуве сьведчыць аб тым, што сучасная пратэставая культура, у прыватнасьці, спантанныя спачатку пратэсты жанчынаў у белым у Беларусі, маюць гістарычную традыцыю і зьяўляюцца натуральнай часткай мясцовых сацыяльна-палітычных практыкаў. Падобныя рухі маюць як важныя сымбалі: колеры, сьцягі, песьні, гімны, — так і сваіх лідарак: Каміла Марцінкевіч, «выбітная дама ў чорным» у XIX стагодзьдзі, і Ніна Багінская, сьцяганосіца і пікетніца, адна з іконаў жанчынаў у белым ці часам жанчынаў у бел-чырвона-белым — у XXI стагодзьдзі. Пры гэтым практыкі рэакцыі з боку ўлады на чорныя ці белыя пратэсты таксама маюць гісторыю і паўтараюцца амаль па гістарычным дакладным сцэнары, вядомым на беларускіх землях з XIX стагодзьдзя.

Не зважаючы на розныя колеры пратэсту — чорны і белы, насамрэч у жаночых пратэстаў XIX і XXI ст.ст. значна больш агульнага, чым адрознага. Так, агульнымі зьяўляюцца асноўныя прычыны пратэстаў: пратэст супраць свавольства, салідарнасьць і маральная

падтрымка арыштаваных, выказваньне ўласнай грамадзянскай пазыцыі. Агульным зьяўляецца і тое, што ў выніку адрознай каштоўнасьці палоў (Héritier, 2008) у традыцыйных грамадзтвах жанчыны як найбольш маргіналізаваныя часьцяком успрымаліся як слабыя, а таму досыць бясьпечныя для ўладаў і грамадзтва. І якраз дзякуючы гэтаму стэрэатыпнаму ўспрыманьню і агульнай маргінальнасьці жанчынаў ці іх меншай каштоўнасьці і важнасьці беларускі карысталіся гэтай «нэгатыўнай прывілеяй» і выходзілі ў публічную прастору для пратэставаньня. Улады як у XIX, так і ў XXI стагодзьдзі не былі гатовыя да такой рэакцыі з прычыны веры ў стэрэатып пра бясьпечную, пасіўную жанчыну.

## Беларускі ў белым<br>у другой палове 2020 — першай палове 2021 году:<br>ад белых пратэстаў да бел-чырвона-белых флэш-мобаў?

Зыходзячы з таго, што жаночыя белыя пратэсты ў Беларусі маюць аналягі ў сацыяльна-палітычнай і гендарнай практыцы іншых краінаў, а таксама ўлічваючы ўласны беларускі гістарычны досьвед жаночых пратэстаў — няхай і пад іншым, чорным колерам — у XIX стагодзьдзі, аналіз сучаснага фэномэну жанчынаў у белым варта разглядаць з улікам чыньніку дыктатуры і жаночай маргінальнасьці, ці, ужываючы канцэпт францускай этналягіні Франсуазы Эрыт'е, «адрознай каштоўнасьці палоў» (Héritier, 2008). Як зазначалася ў папярэдніх частках, гістарычная маргінальнасьць жанчынаў і іх іншасьць, другараднасьць адбіваецца на ўсіх этапах разьвіцьця жанчынаў, у тым ліку на іх пратэставай дзейнасьці: у межах фэмінісцкіх рухаў яны пратэстуюць супраць адсутнасьці правоў альбо супраць іх няроўнага разьмеркаваньня, у межах агульных рухаў яны часта пратэстуюць за справы іншых — сваіх мужоў, дзяцей. У межах новых рухаў — напрыклад, падчас белых маршаў на Кубе ці ў Беларусі — яны пратэстуюць супраць гвалту, супраць арышту і зьняволеньня родных, блізкіх. Часта жанчыны праз сваю маргінальнасьць і другараднасьць у вачох улады, рэжыму арыштоўваюцца пазьней, не чапаюцца, бо ўспрымаюцца як «слабы» і «прыгожы» пол адначасова. Такая традыцыйная ўстаноўка выкліканая адрознай гістарычнай каштоўнасьцю палоў: большай каштоўнасьцю надзяляюцца мужчыны, меншай — жанчыны. Як ні парадаксальна, але часам маргінальнасьць жанчынаў становіцца іх зброяй: у цэлым дыктатуры ў Аргентыне, на Кубе, у Беларусі ці М'янме аднолькава гвалтоўна ставяцца да ўсіх людзей, аднак часта дыктатуры дэманструюць дзіўнае джэнтэльмэнства, у якім хаваюць сваё няўменьне справіцца з маці забітых дзяцей, з пэнсіянэркамі, мнішкамі і пад. Пад уплывам традыцыйных каштоўнасьцяў і ўстановак вельмі часта ў дыктатурах шануецца вобраз, культ

мацi. А таму мацi, якiя пратэстуюць на вулiцах, тым больш калi яны пратэстуюць дзеля сваiх дзяцей, як гэта было ў Аргентыне, могуць на пэўны час зьбянтэжыць аўтарытарныя рэжымы. Так, польская этналягiня i дасьледнiца Беларусi Ганна Энгелькiнг, аналiзуючы пратэсты ў Беларусi, лiчыць, што тлумачэньнi асобнай актыўнасьцi беларусак у «мiрнай рэвалюцыi» трэба шукаць у традыцыйнай культуры (Rewolucja mirnych ludiej, 2020: 94). Беларуская культура досыць прагматычная, абапiраецца на каштоўнасьцi жыцьця. Вядома, кабета адыгрывае асаблiва важную ролю ў пытаньнi жыцьця, бо дае жыцьцё людзям. Таму кабета адыгрывае i цяпер, падчас пратэстаў, актыўную ролю. Да ўсяго вобраз ворага ў беларусаў не ўспрымаецца ў нацыяналiстычных катэгорыях, а хутчэй, у катэгорыi злых цi добрых намераў (Rewolucja mirnych ludiej, 2020: 93–95). Мiлiцыя цi вайскоўцы, якiя атакуюць i зьбiваюць пратэстоўцаў, маюць злыя намеры, а таму i зьяўляюцца ворагамi ў традыцыйным разуменьнi беларусаў. То бок дыктатура i сам дыктатар «зачапiлi», парушылi старыя скрыпты беларускай культуры, ператварыўшыся ў ворагаў. Дыктатура да ўсяго выклiкала гнеў, абурэньне жанчынаў. Этналягiчныя падыход i аналiз дазваляюць на культурным узроўнi зразумець страту легiтымнасьцi дыктатарскага рэжыму i актывацыю традыцыйных рэсурсаў, скрыптаў, якiя, у сваю чаргу, абумоўлiваюць гендарныя зьмяненьнi ў грамадзтве.

У цэлым, пратэставыя маршы беларусак у белым упiсваюцца ў агульную карцiну сацыяльных рухаў, варта дадаць — новых сацыяльных рухаў, «рухаў салiдарнасьцi» цi «эмацыйных рухаў» (Нёвё, 2010: 26), як iх часта называюць у заходняй палiтычнай сацыялёгii. Таксама дасьледнiкi часам вядуць размову пра новыя гендарныя сацыяльныя рухi (Нёвё, 2010: 102). Зьява жанчынаў у белым наагул адрозьнiваецца ад клясычных, цi старых, гендарных гэтак званых «рухаў тоеснасьцi» (Нёвё, 2010: 103), напрыклад, фэмiнiсцкiх, тым, што звычайна не падкрэсьлiваецца наўмысна жаночая iдэнтычнасьць, i ў прынцыпе мэтай гэтых маўклiвых пратэстаў ня ёсьць змаганьне за жаночыя правы. Пры гэтым ва ўмовах недэмакратыi белыя маршы, у прыватнасьцi, беларускiя жаночыя маршы, зьвяртаюць на сябе ўвагу наступнымi рысамi: мiрнасьць, маўклiвасьць, часьцей за ўсё бязьлёзунгавасьць, выключна жаночы склад. I якраз выключна жаночы складнiк белага пратэсту выклiкае пэўныя пытаньнi i блытанiну: цi гэта пераважна жаночы рух без усякiх тоеснасных патрабаваньняў, цi ўсё ж такi гэта фэмiнiсцкi пратэст? З самiх назваў — «жаночыя маршы», «жаночыя пратэсты», «жанчыны ў белым» (Людзi, 2021; Пратэсты, 2021; Выбары, 2020 б) — не заўсёды ясна, якi гэта кшталт руху. Аднак пры аналiзе рэдкiх пасланьняў цi iнтэрвiю ўдзельнiцаў белых маршаў бачна, што для iх важнай зьяўляецца ня проста салiдарнасьць, але i барацьба за дэмакратычнасьць, а часам i за большую жаночую эмансыпацыю. Зрэшты, далучэньне многiх беларусак да пратэстаў было выклiкана

ў тым ліку антыфэміністкімі і мізагіннымі выказваньнямі дыктатара і ўладаў наагул падчас прэзыдэнцкай кампаніі 2020 году і асабліва падчас вылучэньня ў кандыдаткі Сьвятланы Ціханоўскай (Соўсь, 2020; Выбары, 2020 б; Гарбацкі, 2020; Интервью с Ольгой Шпарагой, 2021). Такім парадкам, улічваючы вымярэньне самавызначэньня ўдзельніцаў белых маршаў, можна весьці гаворку ў тым ліку і пра фэміністкае памкненьне маршаў. Дадзеную тэндэнцыю пацьвярджае аналіз дзейнасьці наступнай важнай акторкі пратэставай дзейнасьці беларусак 2020–2021 гадоў. Так, Ніна Багінская, адна зь лідарак жаночых маршаў, увасабляе прыклад таго, як маршы зьмяніліся ад белых да бел-чырвона-белых, ад кансэнсуальных да палітызаваных з моцным нацыянальным пасланьнем, ад жаночых да фэміністкіх, пры гэтым засталіся прынцыпова мірнымі (Выбары, 2020 б; Ніна Багінская пра Беларусь, 2021). Між іншым, спалучэньне мірнага характару, нацыянальнага і фэміністкага пасланьняў сваёй дзейнасьці Ніна Багінская адзначыла сама ў адным з сваіх зваротаў, апублікаваным на старонцы «Нямецкай Хвалі» (Ніна Багінская пра Беларусь, 2021). Грамадзкая дзяячка выразна падкрэсьліла каштоўнасьць фэміністкага дыфэрэнцыялістскага пасланьня («*Беларусь ліцьвінская — краіна жаноцкага роду*», «*Інтэлект жанчыны вышэйшы за мужчынскі, бо, нарадзіўшы дзіця, жанчына мае клопат аб захаваньні роду, а гэта значыць — роднага этнасу, Бацькаўшчыны*»), а таксама адданасьць нацыянальнаму адраджэньню. Да ўсяго Н. Багінская часта спасылаецца ў сваім змаганьні на прыклады іншых слынных беларусак: Эўфрасіньні Полацкай, Саламеі Русецкай, Ларысы Геніюш, Зоські Верас. На сучасным этапе яна прыгадвае тых, хто натхняе яе: С. Ціханоўская, М. Калесьнікава, В. Цапкала (Ніна Багінская пра Беларусь, 2021).

Пэўная эвалюцыя паводзінаў жанчынаў у белым, а таксама зьмяненьне выкарыстаных колераў (спачатку выключна белага, потым бел-чырвона-белага) сьведчыць на карысьць цьверджаньня аб тым, што рух жанчынаў у белым паступова мяняецца: ад выключна эмацыйнага і кансэнсуальнага, першапачаткова белага ён ператварыўся ў рух арганізаваны, з моцным палітычным пасланьнем, увасобленым у ідэйных бел-чырвона-белых колерах. Аб эвалюцыі жаночых белых пратэстаў, якія пачаліся ня як «фэміністкі праект», але хутка такім сталі, піша ў сваім артыкуле і дасьледніца Натальля Паўловіч (Paulovich, 2021: 38). Іншая дасьледніца, філёзафка Вольга Шпарага ў кнізе «У рэвалюцыі жаночае аблічча» (Shparaga, 2021) сьцьвярджае, што грамадзтва нарэшце загаварыла на мове фэмінізму, а жанчыны ў белым — гэта вынік эвалюцыі грамадзтва за апошняе дзесяцігодзьдзе і адна з шматлікіх праяваў мірнай рэвалюцыі, у тым ліку фэміністкай, якая праявілася ў фальсыфікаванай перамозе жанчыны — Сьвятланы Ціханоўскай, у тысячы актаў салідарнасьці і сястрынства ў грамадзтве і г. д. (Интервью с Ольгой Шпарагой, 2021).

Гісторыя жанчынаў у белым у Беларусі пачалася 12 жніўня 2020 году (Людзі, 2021), калі па ўсіх гарадах Беларусі выйшлі дзясяткі тысячаў жанчынаў пераважна ў белым, зь белымі кветкамі ў ланцугі салідарнасьці ў публічных месцах (Выбары, 2020 a). Спачатку белы колер заставаўся галоўным, бо кабеты імкнуліся падкрэсьліць перадусім мірны характар пратэстаў. З кожным днём ланцугі салідарнасьці павялічваліся, кабеты ў белым сьпявалі мірныя песьні, напрыклад, «Калыханку», а пратэстоўкі тлумачылі свой выхад на вуліцу: «*Ужо ня проста фальсыфікуюць выбары, а б'юць, калечаць і забіваюць нас, нашых мужчын, нашых дзяцей. І, магчыма, гэты шанец застаўся толькі ў нас, у жанчын. Здаецца, і статыстычна нас больш у краіне, чым мужчын, то трэба гэта выкарыстоўваць*» (Соўсь, 2020). Паступова, з узмацненьнем рэакцыі ўладаў на жаночыя маршы і самі кабеты ў белым таксама крыху радыкалізаваліся: да ў асноўным белага колеру вопраткі ранейшых пратэстаў далучыліся бел-чырвона-белыя стужкі і сьцягі.

Такім парадкам, пачынаючы зь верасьня 2020 году ўсе жаночыя белыя маршы белымі па колеры больш не зьяўляліся — дамінаваў бел-чырвона-белы колер. Па зьмесьце гэта часта былі белыя жаночыя маршы кшталту тых, якія праводзілі аргентынскія мацеркі ў 1976–1983 гадах ці кубінскія белыя да́мы пятнаццаць ці дзесяць гадоў таму: мірныя, з моцным прадэмакратычным пасланьнем і прапановай кансэнсусу, перамір'я. Дыктатура да канца 2020 году амаль цалкам вынішчыла поле дзейнасьці для ўсіх пратэстоўцаў, уключаючы кабетаў у белым і бел-чырвона-белым. Тым ня менш спарадычныя «маршы суперажываньня» (Пратэсты, 2021) жанчынаў у белым з абавязковым чырвоным аксэсуарам (шалік, парасон, кветка) працягваюцца дасюль. Аднак у другой палове 2021 году жаночыя маршы сталіся мінарытарнымі і імгненнымі, нагадваючы, хутчэй, пэрформанс, акцыянізм і флэш-моб аднначасова, чым звыклы сацыяльны пратэставы рух. Публічнае поле ў Беларусі зачышчана нагэтулькі, што нічога падобнага не маглі зрабіць ані аргентынская хунта за 7–8 гадоў, ані кубінская дыктатура за дзесяцігодзьдзі існаваньня. Якраз зачыстка публічнага поля, прызначэньне вайскоўцаў на высокія пасады і рэпрэсіі зьяўляюцца сьведчаньнем прынцыповай зьмены беларускага рэжыму з дыктатуры ў бок хунты. Узмацненьне жорсткасьці рэжыму не павінна азначаць аўтаматычна спыненьня жаночых бел-чырвона-белых маршаў — іх мінімізацыю і зьначваньне фармату дзейнасьці (ухіл у бок пэрформансу) варта ўспрымаць, хутчэй, як часовае зьмяненьне, як вітoк у эвалюцыі як рэжыму, так і мясцовых грамадзянскай супольнасьці і сацыяльных рухаў. Дарэчы, падобныя віткі зьведалі жаночыя белыя рухі ў Аргентыне і на Кубе, дзе яны існуюць ужо некалькі дзесяцігодзьдзяў насуперак гвалту дыктатуры (Scarpaci, Frazier, 1993: 8–9).

## Заканчэньне

Беларускія пратэсты і, у прыватнасьці, жаночыя белыя пратэставыя маршы 2020–2021 гадоў — зьява новая для беларускай сучаснай гісторыі, хоць, няма сумневу, яны зьяўляюцца натуральнымі праявамі незадаволенасьці беларусаў і беларусак, якая не аднойчы спынялася і замарожвалася рэжымам Лукашэнкі, які адкладаў рэальнае вырашэньне праблемаў на потым. У зьвязку з гэтым, магчыма, мае рацыю дасьледніца Нэлі Бэкус (Bekus, 2021: 4), якая бачыць у сучасных пратэстах рэха 1989 году, водгульле шматлікіх нерэалізаваных нацыянальных і дэмакратычных памкненьняў беларусаў. Няма сумневу, сучасныя пратэсты ў Беларусі, у тым ліку жаночыя пратэсты, маюць гістарычную аснову, доказам чаго зьяўляецца рух жанчынаў у чорным у XIX стагодзьдзі, вядомы на беларускіх, польскіх і летувіскіх землях. Да ўсяго жаночыя пратэсты пад белым ці, дакладней, бел-чырвона-белым колерам упісваюцца ў сусьветную практыку новых гендарных сацыяльных рухаў, вядомых як рухі салідарнасьці ці эмацыйныя рухі. Падобныя рухі існуюць як у дэмакратыі (Бэльгія, Францыя, Швайцарыя), так і ў аўтарытарных рэжымах (Аргентына ў мінулым, цяперашняя Куба). Хоць іх і яднае сымбалічны колер, пол удзельніцаў і мірны, нават кансэнсуальны характар маршаў, часам паміж імі назіраюцца прынцыповыя адрозьненьні, выкліканыя тыпам рэжыму, матывацыямі выхаду на вуліцу, пасланьнямі, якія артыкулююцца падчас маршаў, выбарам палітычнага ці апалітычнага характару дзейнасьці, а таксама гендарнай інклюзіўнасьцю ці эксклюзіўнасьцю.

Да асноўнай спэцыфікі беларускіх жаночых белых пратэстаў можна аднесьці спалучэньне адначасова нацыянальнага і гендарнага пасланьняў, што добра ілюструецца візуальна: жаночыя маршы пачаліся пад белым колерам, але хутка сталіся бел-чырвона-белымі. Камэнтары ўдзельніцаў белых маршаў таксама фіксуюць ня толькі гендарную, але і нацыянальную скіраванасьць супольнага дзеяньня (Соўсь, 2020). А таксама пад уплывам зьмены рэжыму ад дыктатуры да хунты спэцыфічнай сталася эвалюцыя мясцовых жаночых пратэстаў, якія з масавага сацыяльнага руху, які ахопліваў у 2020 годзе ня толькі Менск, але і іншыя гарады краіны, ператварыліся ў 2021 годзе ў нешта пераходнае паміж пэрформансам і флэш-мобам, што адбываецца выключна ў сталіцы.

Параўноўваючы беларускія жаночыя маршы зь іншымі падобнымі зьявамі, найбольшае падабенства можна знайсьці ў кубінскім прыкладзе да́маў у белым: кшталт рэжыму (жорсткі аўтарытарызм ці дыктатура з элемэнтамі хунты), матывацыя руху (салідарызаваньне), мірныя тактыка і пасланьне, сацыяльная і ўзроставая разнастайнасьць удзельніцаў. Гэтае параўнаньне ў некаторай ступені дазваляе прагназаваць далейшае існаваньне і функцыянаваньне беларускіх жаночых пратэстаў, бо і кубінскія да́мы ў белым па

першасьці сутыкаліся з падобнай жорсткасьцю, катастрафічным скарачэньнем маршаў, арыштамі і нават забойствамі з боку ўладаў (Le combat des «Dames en blanc», 2010; Les «Dames en blanc» autorisées, 2010). Аптымістычным зьяўляецца і тое, што кубінскія да́мы ў белым у выніку шматлікіх гадоў пратэстаў паўплывалі на ўлады, якія вызвалілі сотні палітычных дысыдэнтаў.

Зрэшты, гендарнае вымярэньне беларускіх пратэстаў аб'ядноўвае ўсе белыя маршы пад тэмай жаночай салідарнасьці і актыўнасьці, а да ўсяго на практыцы дэманструе ажыцьцяўленьне гендарнай палітычнай позвы дня, якая раней заставалася ў тэорыі, а таму многім не зразумелая ў Беларусі. Цяпер дзякуючы жанчынам у белым гендарнае вымярэньне сацыяльнай і палітычнай мабілізацыі сталася відавочным для бальшыні, усе на практыцы бачаць, што такое гендарная прызма палітыкі, а гендарным дасьледнікам і дасьледніцам ня варта даводзіць карыснасьць катэгорыі гендару ў гісторыі ці ў палітыцы (Гарбацкі, 2020). У зьвязку з гэтым ужытая ў працы для аналізу гендарнага вымярэньня пратэсту этналягічная тэорыя адрознай каштоўнасьці палоў працуе ня толькі ў гістарычнай пэрспэктыве, тлумачачы ўнівэрсальную меншую каштоўнасьць і большую маргінальнасьць кабетаў у гісторыі. Тэорыя працуе і на будучыню: сацыяльныя зьмяненьні ў грамадзтвах, асабліва заходніх, вядуць да перагляду каштоўнасьці палоў, да эгалітарызацыі каштоўнасьці палоў. Якраз у пэўныя гістарычныя моманты традыцыйная адрозная каштоўнасьць палоў ставіцца пад сумнеў, і сацыяльныя практыкі прапануюць новыя візіі ў адносінах і ацэнцы палоў. Якраз падзеі, выкліканыя старэньнем і гвалтам беларускай дыктатуры, — пратэсты і моцная жаночая мабілізацыя — дэманструюць тэндэнцыю як да радыкальных палітычных зьменаў, так і да рэвізіі традыцыйных скрыптаў, перадусім гендарных.

## Літаратура


Блог В. Карбалевіча. (2021) Радыё Свабода, [анлайн] Доступ па: https://www.svaboda.org/z/691 [Прагледжана 1 кастрычніка 2021].

Выбары 2020. (2020 а) Жаночыя «ланцугі салідарнасьці» прайшлі па ўсёй Беларусі, Радыё Свабода, 12 жніўня 2020, [анлайн] Доступ па: https://www.svaboda.org/a/30779898.html [Прагледжана 1 кастрычніка 2021].

Выбары 2020. (2020 б) Жанчыны ў белым зноў выйшлі на вуліцы Менску на акцыю супраць гвалту, Радыё Свабода, 22 жніўня 2020, [анлайн] Доступ па: https://www.svaboda.org/a/30797134.html [Прагледжана 1 кастрычніка 2021].

Гарбацкі, У. (2020) Найноўшая гендарная гісторыя Беларусі пішацца проста цяпер на вуліцах, Новы Час, 21 верасня 2020, [анлайн] Доступ па: https://novychas.by/hramadstva/najnouszaja-hendarnaja-historyja-belarusi-piszacca [Прагледжана 10 кастрычніка 2021].

Интервью с Ольгой Шпарагой. (2021) Философ о белорусской революции: Общество заговорило на языке феминизма, Deutsche Welle, 30 июня 2021, [анлайн] Доступ па: https://www.dw.com/ru/filosof-o-belorusskoj-revoljucii-obshhestvo-zagovorilo-na-jazyke-feminizma-a-58108746/a-58108746 [Прагледжана 10 кастрычніка 2021].
Людзі. (2021) У Менску, як і год таму, выйшлі жанчыны з кветкамі ў белым і чырвоным, Радыё Свабода, 12 жніўня 2021, [анлайн] Доступ па: https://www.svaboda.org/a/31405994.html [Прагледжана 30 верасьня 2021].
Нёвё, Н. (2010) Сацыялогія сацыяльных рухаў, Мінск: Прапілеі, 152 с.
Ніна Багінская пра Беларусь Лукашэнкі і гістарычныя карані беларусаў. (2021) Deutsche Welle, 30 апреля 2021, [анлайн] Доступ па: https://www.dw.com/ru/nina-baginskaja-pra-belarus-lukashenki/a-56961439 [Прагледжана 1 кастрычніка 2021].
Пратэсты. (2021) «Марш суперажываньня»: жанчыны ў белым з чырвонымі парасонамі правялі акцыю ў Менску, Радыё Свабода, 21 чэрвеня 2021, [анлайн] Доступ па: https://www.svaboda.org/a/31318387.html [Прагледжана 30 верасьня 2021].
Соўсь, Г. (2020) «Мы не “авечкі” і не “небаракі”, мы грамадзянкі і палітычная сіла». Галасы жанчын з «ланцугоў салідарнасьці», Радыё Свабода, 13 жніўня 2020, [анлайн] Доступ па: https://www.svaboda.org/a/30781778.html [Прагледжана 1 кастрычніка 2021].
Bekus, N. (2021) Echo of 1989? Protest Imaginaries and Identity Dilemmas in Belarus. *Slavic Review*, 2021, 80 (1), p. 4.
Bekus, N., Gabowitsch, M. (2021) Introduction: The Sociology of Belarusian Protest. *Slavic Review*, 80 (1), pp. 1–3.
Bruchnalska, M. (1933) *Ciche bohaterki. Udział kobiet w powstaniu styczniowym*, Miejsce Piastowe, 1933.
Christian, G. (2014) La marche blanche, un nouveau fait de société. *Cités*, no. 59, pp. 169–179.
Cuba’s “Ladies in White”. (2006) Human Rights First, [анлайн] Доступ па: https://web.archive.org/web/20090720010456/http://www.humanrightsfirst.org/defenders/hrd_cuba/hrd_cuba_blanco.htm [Прагледжана 29 верасьня 2021].
Dybowski, B. (1913) *Wspomnienia z przeszłości półwiekowej: objaśnione czterdziestu kilku rycinami*, Lwów: Nakładem rodziny Autora, s. 35.
Godin, C. (2014) La marche blanche, un nouveau fait de société. *Cités*, no. 59, [анлайн] Доступ па: https://doi.org/10.3917/cite.059.0169 [Прагледжана 29 верасьня 2021].
Héritier, F. (2008) *L’Identique et le Différent: entretiens avec Caroline Broué*, La Tour-d’Aigues, Éditions de l’Aube, 108 p.
Héritier, F. (2010) *Hommes, femmes: la construction de la différence*. Paris: Le Pommier, 191 p.
Ilnicka, M. (2019) Do sióstr moich, [у:] Król, K. Słowem i czynem. Kobieca twórczość poetycka wobec tematyki powstania styczniowego, [у:] Ławski, J., Rusek, I. E., Wojciechowski, P., *Powstanie styczniowe: reinterpretacje pamięci*, Białystok, s. 275–276.
Kergoat, D. (1992) *Les infirmières et leur coordination*, 1988–1989, Paris, Ed. Lamarre, [анлайн] Доступ па: https://www.persee.fr/doc/genre_1165-3558_1993_num_6_1_907_t1_0093_0000_1 [Прагледжана 29 верасьня 2021].
Kowalewska, Z. (1912) *Obrazki Mińskie* 1850–1863, Wilno: I.dr. J. Zawadzki, s. 90.

Le combat des “Dames en blanc” se poursuit à Cuba (2010) L’Express.fr, 19.04.2010, [анлайн] Доступ па: https://www.lexpress.fr/actualite/monde/amerique-sud/le-combat-des-dames-en-blanc-se-poursuit-a-cuba_885831.html [Прагледжана 29 верасьня 2021].
Les “Dames en blanc” autorisées pour la première fois à manifester (2010) France 24, 03.05.2010, [анлайн] Доступ па: https://www.france24.com/fr/20100503-dames-blanc-autorisees-manifester-opposant-cuba-epouses-arrete-havane [Прагледжана 29 верасьня 2021].
Les folles de la Place de Mai (2016), Mémoires, N° 67, [анлайн] Доступ па: https://www.cairn.info/revue-memoires-2016-2-page-23.htm [Прагледжана 29 верасьня 2021].
Les marches blanches se multiplient: pourquoi? (2015) France 3, Info, 19.06.2015, [анлайн] Доступ па: https://france3-regions.francetvinfo.fr/hauts-de-france/2015/06/19/les-marches-blanches-se-multiplient-pourquoi-751263.html [Прагледжана 28 верасьня 2021].
Martysevich, M. (2020) Belarus: The Alphabet of Protest, Culture.pl, 30 October, [анлайн] Доступ па: https://culture.pl/en/article/belarus-the-alphabet-of-protest [Прагледжана 29 верасьня 2021].
Montalembert, Ch. de. (1861) *Une nation en deuil. La Pologne en* 1861, E. Dentu, Paris, p. 48.
Mothers of the Plaza de Mayo (2011) First Responders for Human Rights, University of Denver, [анлайн] Доступ па: https://nanopdf.com/download/mothers-of-the-plaza-de-mayo-first-responders-for-human-rights_pdf [Прагледжана 28 верасьня 2021].
Norris, S. M. (2021) History, Memory, and the Art of Protest in Belarus, Origins, Current Events in Historical Perspective, vol. 14, issue 6, [анлайн] Доступ па: https://origins.osu.edu/article/history-memory-and-art-protest-belarus [Прагледжана 29 верасьня 2021].
On Fourth Anniversary of Clampdown (2007) Rights Group Calls for Release of Prisoners, Human Rights First, March 19, [анлайн] Доступ па: https://www.humanrightsfirst.org/2007/03/19/On-Fourth-Anniversary-of-Clampdown-Rights-Group-Calls-for-Release-of-Prisoners [Прагледжана 30 верасьня 2021].
Paulovich, N. (2021) How Feminist is the Belarusian Revolution? Female Agency and Participation in the 2020 Post-Election Protests, *Slavic Review*, vol. 80 (1), pp. 38 — 44.
Reichardt, I., Rust, M. (2021) The failure in binary thinking about Belarus, New Eastern Europe, Issue 1-2: Whither Democracy? [анлайн] Доступ па: https://neweasterneurope.eu/2021/02/03/the-failure-in-binary-thinking-about-belarus/ [Прагледжана 29 верасьня 2021].
Retour sur la Coordination des Infirmières de 1988 (2015) Révolution permanente, 22 juin 2015, [анлайн] Доступ па: https://www.revolutionpermanente.fr/Retour-sur-la-Coordination-des-Infirmieres-de-1988 [Прагледжана 30 верасьня 2021].
Rewolucja mirnych ludiej (2020) Z Anną Engelking, antropolożką i badaczką kultury białoruskiej, rozmawia Anna Łazar, Nowa Europa Wschodnia, nr 6/2020, s. 94.
Rodríguez, L. G., Soprano, G. (2009) La política universitaria de la dictadura militar en la Argentina: proyectos de reestructuración del sistema de educación superior (1976–1983), Nuevo Mundo Mundos Nuevos, Cuestiones del tiempo presente, [анлайн] Доступ па: https://hear.unr.edu.

ar/wp-content/uploads/2014/12/La-pol%C3%ADtica-universitaria-de-la-dictadura-militar-en-la-Argentina-proyectos-de-reestructuraci%C3%B3n-del-sistema-de-educaci%C3%B3n-superior-1976-1983.pdf [Прагледжана 30 верасьня 2021].

Sarner, E. (2000) Mères et “folles” sur la place de Mai: Argentine 1976–2000, Irenees.net, [анлайн] Доступ па: http://www.irenees.net/bdf_fiche-documentation-188_fr.html [Прагледжана 28 верасьня 2021].

Sawer, M. (2007) Wearing your Politics on your Sleeve: The Role of Political Colours in Social Movements, *Social Movement Studies*, vol. 6 (1), pp. 39–56.

Scarpaci, J. L., Frazier, L. Jo. (1993) State terror: ideology, protest and the gendering of landscapes, *Progress in Human Geography*, vol. 17 (1), pp. 8–9, [анлайн] Доступ па: https://deepblue.lib.umich.edu/bitstream/handle/2027.42/68892/10.1177_030913259301700101.pdf;sequence=2 [Прагледжана 30 верасьня 2021].

Sierakowski, S. (2020) Belarus Uprising: The Making of a Revolution, *Journal of Democracy*, vol. 31 (4), pp. 5–16.

Shparaga, O. (2021) *Die Revolution hat ein weibliches Gesicht; Der Fall Belarus*, Taschenbuch. Suhrkamp Verlag, 234 p.

Tondeur, A. (1997) *La crise blanche: la Belgique du chagrin à la colère*, Bruxelles, Editions Luc Pire, 108 p.

Wright, T. C. (2006) *State Terrorism in Latin America: Chile, Argentina, and International Human Rights (Latin American Silhouettes)*, Rowman & Littlefield. 160 p.

Wspomnienia wygnańca (1908) Goniec Wileński Polityczny, Społeczny i Literacki R.1, 17 kwietnia 1908, s. 2.

Zakrzewski, P. (2017) Czarny protest A.D. 1861, Culture.pl, 10 maj, [анлайн] Доступ па: https://culture.pl/pl/artykul/czarny-protest-ad-1861 [Прагледжана 30 верасьня 2021].

## References

Blog V. Karbalevica [V. Karbalevic’s blog]. (2021) *Radyje Svaboda*, [online] Available from: https://www.svaboda.org/z/691 [Accessed 1 October 2021].

Vybary 2020 a. (2020) Zhanocyja “lancuhi salidarnas’ci” prajsli pa ŭsej Belarusi [Women’s “chains of solidarity” passed all over Belarus ], *Radyje Svaboda*, August 12, [online] Available from: https://www.svaboda.org/a/30779898.html [Accessed 1 October 2021].

Vybary 2020 b. (2020) Zhancyny ŭ belym znoŭ vyjsli na vulicy Mensku na akcyju suprac’ gvaltu [Women in white took to the streets of Minsk again to protest against violence], *Radyje Svaboda*, August 22, [online] Available from: https://www.svaboda.org/a/30797134.html [Accessed 1 October 2021].

Harbacki, U. (2020) Najnoŭsaja gendarnaja historyja Belarusi pisacca prosta ciaper na vulicakh [The latest gender history of Belarus is being written on the streets right now], *Novy Cas*, September 21, [online] Available from: https://novychas.by/hramadstva/najnouszaja-hendarnaja-historyja-belarusi-piszacca [Accessed 10 October 2021].

Interv'iu s Ol'goi Sparaga. (2021) Filosof o belorusskoi revoliutsii: Obshchestvo zagovorilo na iazyke feminizma [Philosopher about the Belarusian Revolution: Society spoke the language of feminism], *Deutsche Welle*, June 30, [online] Available from: https://www.dw.com/ru/filosof-o-belorusskoj-revoljucii-obshhestvo-zagovorilo-na-jazyke-feminizma-a-58108746/a-58108746 [Accessed 10 October 2021].

Liudzi (2021) U Mensku, jak i hod tamu, vyjsli zhancyny z kvetkami ŭ belym i cyrvonym [In Minsk, as a year ago, women with flowers in white and red came out], *Radyje Svaboda*, August 12, [online] Available from: https://www.svaboda.org/a/31405994.html [Accessed 30 September 2021].

Neve, N. (2010) *Sacyjalogija sacyjal'nykh rukhaŭ* [*Sociology of social movements*], Minsk: Prapilei.

Nina Bahinskaja pra Belarus' Lukasenki i histarycnyja karani belarusaŭ (2021), *Deutsche Welle*, 30 April 2021, [online] Available from: https://www.dw.com/ru/nina-baginskaja-pra-belarus-lukashenki/a-56961439 [Accessed 1 October 2021].

Pratesty (2021) "Mars superazhyvan'nia": zhancyny ŭ belym z cyrvonymi parasonami praviali akcyju ŭ Mensku [March of compassion: women in white with red umbrellas organized a march in Minsk], *Radyje Svaboda*, 21 June, [online] Available from: https://www.svaboda.org/a/31318387.html [Accessed 30 September 2021].

Soŭs', H. (2020) "My ne "avecki" i ne "nebaraki", my hramadzianki i palitycnaia sila". Halasy zhancyn z "lancuhoŭ salidarnas'ci" ["We are not 'sheep' or 'poor', we are citizens and a political force". Voices of women from the "chains of solidarity"], *Radyje Svaboda*, 13 August, [online] Available from: https://www.svaboda.org/a/30781778.html [Accessed 1 October 2021].

Bekus, N. (2021) Echo of 1989? Protest Imaginaries and Identity Dilemmas in Belarus, *Slavic Review*, 2021, 80 (1), p. 4.

Bekus, N., Gabowitsch, M. (2021) Introduction: The Sociology of Belarusian Protest, *Slavic Review*, 80 (1), pp. 1–3.

Bruchnalska, M. (1933) *Ciche bohaterki. Udział kobiet w powstaniu styczniowym*, Miejsce Piastowe, 1933.

Christian, G. (2014) La marche blanche, un nouveau fait de société, *Cités*, n°59), pp. 169–179.

Cuba's "Ladies in White" (2006), Human Rights First, [online] Available from: https://web.archive.org/web/20090720010456/http://www.humanrightsfirst.org/defenders/hrd_cuba/hrd_cuba_blanco.htm [Accessed 29 September 2021].

Dybowski, B. (1913) *Wspomnienia z przeszłości półwiekowej: objaśnione czterdziestu kilku rycinami*, Lwów: Nakładem rodziny Autora, s. 35.

Godin, C. (2014) La marche blanche, un nouveau fait de société, *Cités*, 59, [online] Available from: https://doi.org/10.3917/cite.059.0169 [Accessed 29 September 2021].

Héritier, F. (2008) *L'Identique et le Différent: entretiens avec Caroline Broué*, La Tour-d'Aigues, Éditions de l'Aube.

Héritier, F. (2010) *Hommes, femmes: la construction de la différence*, Paris, Le Pommier.

Ilnicka, M. (2019) Do sióstr moich, [y:] Król, K. Słowem i czynem. Kobieca twórczość poetycka wobec tematyki powstania styczniowego, [y:] Ławski, J., Rusek, I. E., Wojciechowski, P., *Powstanie styczniowe: reinterpretacje pamięci*, Białystok, s. 275–276.

Kergoat, D. (1992) *Les infirmières et leur coordination*, 1988–1989, Paris, Ed. Lamarre, [online] Available from: https://www.persee.fr/doc/genre_1165-3558_1993_num_6_1_907_t1_0093_0000_1 [Accessed 29 September 2021].

Kowalewska, Z. (1912) *Obrazki Mińskie* 1850–1863, Wilno: I.dr. J. Zawadzki, s. 90.

Le combat des “Dames en blanc” se poursuit à Cuba (2010) *L’Express.fr*, 19.04.2010, [online] Available from: https://www.lexpress.fr/actualite/monde/amerique-sud/le-combat-des-dames-en-blanc-se-poursuit-a-cuba_885831.html [Accessed 29 September 2021].

Les “Dames en blanc” autorisées pour la première fois à manifester (2010) *France* 24, 03.05.2010, [online] Available from: https://www.france24.com/fr/20100503-dames-blanc-autorisees-manifester-opposant-cuba-epouses-arrete-havane [Accessed 29 September 2021].

Les folles de la Place de Mai (2016), *Mémoires*, N° 67, [online] Available from: https://www.cairn.info/revue-memoires-2016-2-page-23.htm [Accessed 29 September 2021].

Les marches blanches se multiplient: pourquoi? (2015) *France* 3, Info, 19.06.2015, [online] Available from: https://france3-regions.francetvinfo.fr/hauts-de-france/2015/06/19/les-marches-blanches-se-multiplient-pourquoi-751263.html [Accessed 28 September 2021].

Martysevich, M. (2020) Belarus: The Alphabet of Protest, *Culture.pl*, 30 October, [online] Available from: https://culture.pl/en/article/belarus-the-alphabet-of-protest [Accessed 29 September 2021].

Montalembert, Ch. de. (1861) *Une nation en deuil. La Pologne en* 1861, E. Dentu, Paris, 1861.

Mothers of the Plaza de Mayo (2011) First Responders for Human Rights, *University of Denver*, [online] Available from: https://nanopdf.com/download/mothers-of-the-plaza-de-mayo-first-responders-for-human-rights_pdf [Accessed 28 September 2021].

Norris, S. M. (2021) History, Memory, and the Art of Protest in Belarus, *Origins, Current Events in Historical Perspective*, vol. 14, issue 6, [online] Available from: https://origins.osu.edu/article/history-memory-and-art-protest-belarus [Accessed 29 September 2021].

On Fourth Anniversary of Clampdown (2007) Rights Group Calls for Release of Prisoners, *Human Rights First*, March 19, [online] Available from: https://www.humanrightsfirst.org/2007/03/19/On-Fourth-Anniversary-of-Clampdown-Rights-Group-Calls-for-Release-of-Prisoners [Accessed 30 September 2021].

Paulovich, N. (2021) How Feminist is the Belarusian Revolution? Female Agency and Participation in the 2020 Post-Election Protests, *Slavic Review*, 80 (1), p. 38.

Reichardt, I., Rust, M. (2021) The failure in binary thinking about Belarus, *New Eastern Europe*, Issue 1–2: Whither Democracy? [online] Available from: https://neweasterneurope.eu/2021/02/03/the-failure-in-binary-thinking-about-belarus/ [Accessed 29 September 2021].

Retour sur la Coordination des Infirmières de 1988 (2015) Révolution permanente, 22 juin 2015, [online] Available from: https://www.revolutionpermanente.fr/Retour-sur-la-Coordination-des-Infirmieres-de-1988 [Accessed 30 September 2021].

Rewolucja mirnych ludiej (2020) Z Anną Engelking, antropolożką i badaczką kultury białoruskiej, rozmawia Anna Łazar, Nowa Europa Wschodnia, nr 6/2020, s. 94.
Rodríguez, L. G., Soprano, G. (2009) La política universitaria de la dictadura militar en la Argentina: proyectos de reestructuración del sistema de educación superior (1976–1983), Nuevo Mundo Mundos Nuevos, Cuestiones del tiempo presente, [online] Available from: https://hear.unr.edu.ar/wp-content/uploads/2014/12/La-pol%C3%ADtica-universitaria-de-la-dictadura-militar-en-la-Argentina-proyectos-de-reestructuraci%C3%B3n-del-sistema-de-educaci%C3%B3n-superior-1976-1983.pdf [Accessed 30 September 2021].
Sarner, E. (2000) Mères et "folles" sur la place de Mai: Argentine 1976–2000, Irenees.net, [online] Available from: http://www.irenees.net/bdf_fiche-documentation-188_fr.html [Accessed 28 September 2021].
Sawer, M. (2007) Wearing your Politics on your Sleeve: The Role of Political Colours in Social Movements, *Social Movement Studies*, 6 (1), pp. 39–56.
Scarpaci, J. L., Frazier, L. Jo, State terror: ideology, protest and the gendering of landscapes, *Progress in Human Geography*, 17 (1) 1993, pp. 8–9, [online] Available from: https://deepblue.lib.umich.edu/bitstream/handle/2027.42/68892/10.1177_030913259301700101.pdf;sequence=2 [Accessed 30 September 2021].
Sierakowski, S. (2020) Belarus Uprising: The Making of a Revolution, *Journal of Democracy*, vol. 31, no. 4, pp. 5–16.
Shparaga, O. (2021) *Die Revolution hat ein weibliches Gesicht; Der Fall Belarus*, Taschenbuch.
Tondeur, A. (1997) *La crise blanche: la Belgique du chagrin à la colère*, Bruxelles, Editions Luc Pire.
Wright, T. C. (2006) *State Terrorism in Latin America: Chile, Argentina, and International Human Rights (Latin American Silhouettes)*, Rowman & Littlefield. p. 160.
Wspomnienia wygnańca (1908) Goniec Wileński Polityczny, *Społeczny i Literacki* R.1, 17 kwietnia 1908, s. 2.
Zakrzewski, P. (2017) Czarny protest A.D. 1861, Culture.pl, 10 maj, [online] Available from: https://culture.pl/pl/artykul/czarny-protest-ad-1861 [Accessed 30 September 2021].